пазашкольнага выхавання і навучання; навук.-практычны, інфармацыйна-аналітычны і каардынуючы цэнтр сістэмы павышэння кваліфікацыі. На базе акадэміі праводзяцца рэсп. і міжнар. навук.-практычныя канферэнцыі, конкурсы прафес. майстэрства педагогаў, рэсп. метадычныя выстаўкі. Ажыццяўляецца метадычнае і арганізацыйнае забеспячэнне падрыхтоўкі і ўдзелу зборных каманд школьнікаў Рэспублікі Беларусь у міжнар. алімпіядах. Працуе клуб «Хрустальны журавель», які аб'ядноўвае лаўрэатаў і пераможцаў рэсп. конкурсу прафес. майстэрства педагогаў «Настаўнік года». *А.І.Таўгень.*

**АКАЗІЯНАЛІЗМЫ** (ад лац. occasionalis выпадковы), індывідуальна-стылістычныя, аўтарскія новаўтварэнні, якія ўзнікаюць пад уплывам кантэксту, канкрэтнай маўленчай сітуацыі. А. ствараюцца паводле прадуктыўных/непрадуктыўных мадэлей літ. мовы на базе ўжо існуючых адзінак і характарызуюцца павышанай выразнасцю («У белых далях застагналі снежнарукія вятры». М.Багун; «Газетная кампанія, узнятая супраць мяне Лінам, выклікала ультрафіялетавы настрой». А.Мрый). Аказіянальныя словы з'яўляюцца пераважна вынікам індывід. словатворчасці і дэманструюць патэнцыяльныя магчымасці моўнай сістэмы («скурганіць», «небазор», «прасветач» — Я.Купала, «светазор», «вольнаплынны», «цемнакрыліць» — Я.Колас, «русакудры», «ціхакрылы», «буйнавіры» — Ю.Таўбін і інш.), аднак многія з іх становяцца здабыткам нац. мовы і пераходзяць у актыўны слоўнікавы склад («прахаладзь», «сумота», «цемрадзь» — Я.Колас, «адлюстроўваць», «дабрабыт», «мілагучны», «ажыццяўленне» — У.Дубоўка, і інш.). У бел. лінгвістыцы даследаванні А. прадстаўлены працамі Г.І.Басавай, У.А.Бобрыка, М.С.Васілеўскага, І.П.Казейкі, М.Р.Прыгодзіча, М.В.Шабовіча і інш.

*Літ.*: Лексікалогія беларускай літаратурнай мовы. Мінск, 1994; Шабовіч М.В. Аказіянальныя словы ў беларускіх мастацкіх тэкстах 20-х гг. XX ст. Мінск, 2004. *Дз.В.Дзятко.*

**АКАЗІЯНА́ЛЬНЫЯ АБРА́ДЫ**, традыцыйныя абрады, якія праводзіліся ў выпадку ўзнікнення сітуацый, выкліканых парушэннем звыклага жыцця, з прычыны вострай неабходнасці яе змянення. Да іх адносяцца: абрады выклікання дажджу (сімвалічнае аранне або баранаванне вадаёма, які высах, дарогі, забіванне жабы, вужа, рака, разбурэнне мурашніка і г.д.), заклінання марозу; абрады, накіраваныя на суцішэнне ці прадухіленне граду, навальніцы, пажару, распаўсюджвання хваробы, і г.д. У часы язычніцтва абрадавымі сродкамі выступалі розныя матэрыяльныя рэчы, абрадавая ежа, вада, жывёлы і птушкі. Падчас правядзення А.а. чалавек звяртаўся да прыродных сіл і стыхій, чытаў пэўныя магічныя тэксты і выконваў дзеянні. Пасля прыходу хрысціянства абрадавыя элементы дапоўніліся царк. атрыбутамі і тэкстамі, што садзейнічала развіццю аказіянальнай абраднасці ў новых сац. умовах. Некаторыя з А.а. і паэт. твораў з цягам часу трансфармаваліся ў дзіцячыя песні, гульні і інш. жанры фальклору. Існуе шмат дзіцячых заклічкаў і прыгаворак з архаічнымі зачынамі. Напр., «Дожджык, дожджык, секані (сыпані, прыпусці, перастань)...», «Сонца, сонца, выблесні ў аконца!», «Соўнушка-ядрушка, выблесні, выглянi!».

*Літ.*: Чистов К.В. К классификации обрядов жизненного цикла // Язычество восточных славян. Ленинград, 1990; Байбурин А.К. Ритуал в традиционной культуре. Санкт-Петербург, 1993; Бабчанок М.А. Семантыка і змест аказіянальных абрадаў і звычаяў // Весці БДПУ. Сер. 2. 2006. №1. *М.А.Бабчанок.*

**АКАЛІЧНАСЦЬ**, даданы член сказа, які характарызуе розныя ўмовы дзеяння, паказвае на спосаб, меру і ступень выяўлення дзеяння ці прыметы. У бел. мове А. сінтаксічна звязваюцца з гал. словамі пры дапамозе кіравання і прымыкання. Ролю А. выконваюць прыслоўе: «Груша расцвіла ноччу» (М.Лынькоў); дзеепрыслоўе: «Жаваранак і шпак, спяваючы, не хаваліся» (Я.Брыль); назоўнік ва ўскосных склонах з прыназоўнікам ці без яго: «Толькі пад вечар увайшлі яны ў бабуліну хату» (М.Капыловіч); інфінітыў «Будзяцца людзі, з хат выбіраюцца яркі калядны дзень прывітаць» (Я.Купала); сінтаксічна непадзельнымі і фразеалагічнымі словазлучэннямі: «Бярозка любае радзімы спявае мне на усе лады» (М.Хведаровіч). У залежнасці ад сінтаксічнага значэння вылучаюць А. месца, часу, прычыны, мэты, уступкі, спосабу дзеяння, меры і ступені. *Т.Ф.Рослік.*

**АКАЛО́ВА**, вёска ў Лагойскім р-не. За 35 км на Пн ад Лагойска, 60 км ад чыг. ст. Смалявічы на лініі Мінск—Орша, на аўтадарозе Мінск—Віцебск. Цэнтр Акалоўскага с/с. 47 гаспадарак, 115 ж. (2009).

У 1770 мястэчка ў ВКЛ. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у складзе Рас. імперыі, у Барысаўскім павеце Мінскай губ. З 20.8.1924 вёска, цэнтр сельсавета Плешчаніцкага р-на Барысаўскай акругі, 24.9.1926 сельсавет рэарганізаваны ў нац. польскі, з 9.6.1927 у Мінскай акрузе (да 26.7.1930), з 26.5.1935 бел. сельсавет, з 20.2.1938 у Мінскай вобл. У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 да ліп. 1944 А. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. З 25.12.1962 у Лагойскім р-не.

У 2009 сярэдняя школа, магазін, кафэ, лясніцтва; царква ў гонар іконы Маці Божай Казанскай (2006).

**АКАМПАНЕМЕ́НТ** (франц. accompagnement ад accompagner суправаджаць), музычнае суправаджэнне, 1) партыі аднаго ці некалькіх інструментаў або пеўчых галасоў у ансамблі, падпарадкаваныя гал., сольнай партыі. 2) Кампанент муз. тканіны (мелодыка-гарманічная апора асн. голасу), які выконвае функцыю суправаджэння (інтанацыйна-меладычнага,